БЕЛАРУСКІ ЗВОН

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9). Рэдакцыя адчынена: 12—2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі на адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам аутара і адрасам для ведама Рэдакцыі). Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 50 м.
Падпіска на 3 месяцы каштуе 600 м. (з дастаўкай да хаты).
Цана абвестак: перад тэкстам 200 мк., сярод тэксту 300 мк. і на апошняй страніцы 1.0 мк. за радок пэтыту у 1 шпальт.

Год II. **Вільня, Чацьвер, 28-га верасьня 1922 г.** **№ 22 (47).**

БЕЛАРУСКІ ПРАДВЫБАРНЫ СХОД

У НЯДЗЕЛЮ, 1 кастрычнік, а 12 гадз. дня ў залі

Драматычнае Майстроўні,
Вострабрамская 9,

адбудзецца **ПРАДВЫБАРНЫ СХОД ВЫБАРШЧЫКАЎ БЕЛАРУСАЎ.**

Сход склікае Беларускі Цантральны Выбарны Камітэт.

16.

Ужо ведамы нумэр сьпіску кандыдатаў у Сойм і Сэнат, за каторы на ўсенькім абшары Польскага гаспадарства будуць падаваць голас усе грамадзяне няпольскае нацыянальнасьці.

Нумэр гэты — шаснаццаты.

Пад гэтым нумэрам у беларускіх акругох выставіць кандыдатаў у Сойм і Сэнат ад імя арганізаванага беларускага грамадзянства Беларускі Цантральны Выбарны Камітэт.

Каля гэтага нумэру павінны згуртавацца, павінны даць за яго галасы ўсе сапраўдныя сыны Беларускага народу.

Людзі, якія будуць выстаўлены на сьпісках пад нумэрам шаснаццатым, — гэта косьць з косьці і кроў з крыві нашага прапоўнага народу. Сам-жа народ на перадвыбарных зьездах у кожным акрузе зацьвердзіць кандыдатаў у Сойм і Сэнат.

У тым-то і сіла сьпіску нумэр шаснадцаты Гэта-ж і зьяўляецца прычынай таго, што розныя чорныя сілы ужо распачалі барацьбу проці яго.

Проці нашага сьпіску згоднай хэўрай падняліся і польскія эндэкі, і польскія дэмакраты розных кірункаў, і ўсе тыя, хто жыве падбіраючы крошкі з панскага стала. Проці нашага сьпіску паны змабілізавалі і так-званых „беларускіх беспартыйных актывістаў“, выслугуючыхся дэфэнзыве, і фальшывых расейскіх эсэраў ці трудавікоў, якія пад штандарам соцыялізму стараюцца разьбіць еднасьць беларускага грамадзянства і адцягнуць яго ад саюзу з другімі бязпраўнымі народамі Польскага гаспадарства. І вось розныя ваўкі ў авечай скуры будуць падхадзіць да нашага сялянства, будуць салодкімі словамі і брахлівымі абяцанкамі падманываць нашу вёску на адступніцтва ад вялікае справы барацьбы за нашае права, волю, зямлю.

Ня верце ім, беларусы, бо на думцы ў іх у ўсіх — адно: вашымі галасамі прайсьці ў Сойм і там фальшаваць вашу волю. Ня верце, бо ўсе гэтыя чужыя нам партыі, кіраваныя варшаўскімі верхаводамі, прымусяць вас заплаціць страшэнную цану за кожын за іх-жа пададзены на выбарах голас: выбіраючы іх кандыдатаў, паслухмяных Варшаве, вы самі сабе наложыце пятлю на шыю, самі сабе выкапаеце магілу.

Верце і падавайце свой голас адно толькі за сьпісак Блёку Нацыянальных Меншасьцей № 16, дзе кандыдатаў уліша згодна з вашай воляй Беларускі Цантральны Выбарны Камітэт.

✦✦✦✦

Фальшаваньне самаупраўленьня.

Мы ўжо пісалі ў „Звоне“ аб тым, што пры выбарах у гмінныя рады, якія адбываліся гэтым летам, шмат дзе народ выявіў вялікую сьвядомасьць і павыбіраў людзей, што бязумоўна будуць бараніць народныя патрэбы і правы ад усіх, хто будзе пасягаць на іх. Склад гмінных рад часта-густа бывае цяпер чыста беларускі. У рэзультаце—там, дзе дагэтуль гаспадарылі назначаныя ўладай палякі—паны і паўпанкі, дзе школы беларускія зачыняліся і разганяліся, дзе ўрадовая статыстыка знаходзіла адно толькі „польскае“ насяленьне,—там цяпер звычна гудзіць беларускі голас, і новыя гмінныя рады выракаюцца гвалтам заведзеных польскіх школ і пастанаўляюць адкрываць беларускія школы. Ня будзем пералічаць усіх тых месц, дзе народ беларускі здалеў на выбарах гмінных рад выявіць сваё абліччa. Даволі адзначыць, як прыклад, хоцьбы Пастаўскую гміну, якая пастанавіла адкрыць 16 беларускіх школ—а такіх гмін усё больш прыбывае.

Выяўленьне права выбарнасьці ў гміне зьяўляецца, паміж іншым, права выбару войта. Гэта зусім цьвёрда ўстаноўлена законам. Зусім зразумела, што раз склад гміны—беларускі, дык гмінная рада выбірае за войта свайго ж беларуса. Вось, гэтага польская адміністрацыя сьцярпець ня можа: у такіх прыпадках старасты не толькі не зацьвярджаюць выбарных войтаў, а проста назначаюць угодных сабе людзей на гэтае выбарнае становішча. Цікавы прыклад гэткага нарушэньня выбарнасьці дае Нова-Пагосцкая гміна.

Тутака ўлетку гміна выбрала за войта свайго чалавека, Чырвінскага (8 галасоў за і 2 проці). Стараста адмовіўся зацьвярдзіць яго і загадаў зрабіць новыя выбары. На другіх выбарах ізноў выбралі таго-ж Чырвінскага, але цяпер ужо аднагалосна: за яго падалі свае галасы і тыя, хто раней быў проці яго. Стараста ізноў не зацьвярдзіў яго і бяз ніякіх выбараў назначыў за войта суседняга паўпанка Федаровіча. Ды гэтага пану старасьце выдалася мала: каб забраць у рукі непакорную гмінную раду, высялілі даўнейшага пісара—тутэйшага чалавека і на яго месца пасадзілі новага, выпісанага ажно з Каліша.

Мы гаворым аб Новым Пагосьце, як аб прыкладзе, бо гэта-ж цэлая напярод аадуманная сыстэма нішчэньня беларускага ўплыву на самаўпраўленьне. З гэтай сыстэмай можна змагацца толькі адным спосабам: у Сойме і Сэнаце А дзеля гэтага яшчэ раз скажам: **глядзіце, беларусы, каб паслалі туды такіх дэпутатаў, якіх не перакупяць ні панская ласка, ні грошы, ні ўсялякія пасулы і абяцанкі.**

Дык-жа ўсе на выбары — дружна, адналіта як сьцяна!

Усе падавайце галасы за сьпісак, які абвесьціць Беларускі Цантральны Выбарны Камітэт.

Ів. Мялешка.

✦✦✦✦

Нашыя грамадзкія абавязкі.

Усё часьцей, гусьцей з розных месц даходзяць да нас чуткі, што сяляне больш аткрыта і рашуча прымаюць чыннасьць у выбарнай працы як прадстаўнікі вясковай інтэлігенцыі. Асабліва у глухіх кутках нашага края інтэлігенцыя баіцца аткрыта выступаць, даваць сваё імя, закладываць К-ты, ладзіць мітынгі, сходкі — адным словам баіцца не хаваючыся, з грамадзкай адвагай прымаць чыннасьць у выбарнай справе.

Праўда праcьледуецца усім ведама з якой дзікай грубасьцяй чорнымі сіламі краёвая інтэлігенцыя з прышчэпленай беларускасьцю як неміласэрна топчыцца паліцэйскімі ботамі рунь—маладая беларуская інтэлігенцыя.

Усім ведама, што то тут, то там арыштовываюць у зьвязку з выбарамі нашых людзей, садзюць у вастрогі, угражаюць рознымі карамі за усякую выбарную працу, за распаўсюжываньне літэратуры, за збор подпісаў аб далучэньні да Выбарнага Камітэта і г. д

У канцы пастараемся растлумачыць як дрэнна для насільнікаў і як добра для нас канчаюцца усе такія брыдкія паступкі неразумных ліхадзееў-прадстаўнікоў месцовай улады.

А цяпер адзначым як беспадстаўны і як моцна шкодзіць нашай справе гэты пусты, а нават і не зразумелы страх выпаўняць тое, што Польская Канстытуцыя і Выбарны Закон лічаць ня толькі правам, але і абавязкам для кожнага грамадзяніна.

Аткрыта, сьмела і спакойна працаваць у ўсей выбарнай чыннасьці трэба ня толькі дзеля таго, што гэтага патрабуе закон, ня толькі каб выканаць бліжэйшую задачу і выбраць добрых сваіх людзей у Сойм, але мы павінны сьмела і з радасьцяй працаваць у выбарнай справе для больш важнай мэты гэта, каб заваяваць сабе волю і стацца вольным грамадзянінам ня толькі на час выбараў, але і назаўсегды.

Толькі той чалавек — настаяшчы чалавек, — вясёлы і шчаслівы, хто вольны

У ваўсіх так назыв. дэмакратычных рэспубліках вярхоўным валадаром дзяржавы зьяўляецца сам народ Польская Канстытуцыя так і пачына ецца што вярхоўная Улада належыць Народу. Праўда, мы гэтага яшчэ ня бачылі ў жыцьці, а толькі чыталі. А бачылі мы толькі як народ усе пагарджаюць, ашуківаюць і як з яго груба зьдзекуюцца.

Дык жа вось цяпер гэтаму павінен прысьці канец, цяпер іменна гэтую самую канстытуцыю сам народ праз сваіх выбарных павінен увясьці ў жыцьцё, здзейсьніць яе — гэта самае галоўнае.

Тут трэба заўважыць, што ў сучаснай Польскай Рэспубліцы ад самага Пілсудзкага да простага стражніка ўсе павінны атрымліваць даручэньні ад Народу.

Вось у чым сутнасьць дэмакратыі.

І час выбараў ёсьць той час, калі народ дае новыя даручэньні і упаўнаважаньні уладзе дзяржавы і судзіць усіх прадстаўнікоў папярэдняй улады.

Бывае так, што ўлада альбо самачынна, насільна захопліваецца адзінкамі, альбо выбраная народам часта забываецца на народную волю. І вось рана ці позна прыходзіць народны суд. Час выбараў і ёсьць гэткім народным судом, калі ўвесь народ выступае як вярхоўны судзьдзя. Час выбараў ёсьць часам народнага суда над усімі ліхімі ўладарамі.

У часе выбараў увесь народ выходзіць на сцэну і назначае на пяць гадоў новых управіцеляў—прадстаўнікоў сваіх, інакш кажучы, выбірае новы Сойм. Сойм жа выбіраець Прэзыдэнта Рэспублікі і міністраў. Міністры назначаюць ваяводаў і ўсіх чыноўнікаў да стражніка.

З гэтага мы бачым, што ўся ўлада ад Прэзыдэнта да стражніка назначаецца народам праз сваіх паслоў у Сойме. Што ўлада служыць народу, а не народ уладзе

Дык жа мы бачым на сколькі ёсьць важны выбарны час, насколькі гэты выбарны час ёсьць важны для нас—беларускага народу.

Трэба каб кожны грамадзянін уразумеў і помніў якую сілу і значэньне

Беларуская інтэлігенцыя, сяляне і работнікі, рыхтуйцеся да выбараў, трэбуйце, каб незапісаных запісывалі у сьпіскі выбаршчыкаў!

ён мае цяпер, каб паважаў сябе і не баяўся тых злых людзей, якія стараюцца запужаць, якія нарушаюць выбарны закон. Час выбараў рашуча напамінае ўсім уладам, што іхняе бытаваньне залежыць ад народу. У час выбараў кожны ліхі вураднік, паліцэйскі насільнік і кожны, пакуль безнаказны, казнакрад знаець, што ім можна ўтрымацца толькі ашукаўшы народ. Вось чаму ў час выбараў усе кідаюцца ў гушчу народную, ўсякія партыі, важныя паны і чыноўнікі панібратаюцца з заняхаеным сярмяжнікам, суляць залатыя горы, каб толькі вымантачыць, даражэй усяго ў сучаны мамэнт гэта **голас выбаршчыка.**

А з другога боку гэтыя паны і іх атражнікі папрабуюць наш забіты, пакрыўджаны векавечнай няволяй і некалькімі акупацыямі народ, запужаць арыштамі і угрозамі, каб толькі гэты народ не галасаваў за сваіх лепшых людзей. І чым больш будзе грaзіць народны суд гэтым насільнікам, тым вастрэй будуць яны ўжываць сваю часовую паганую моц. Толькі ня бойцеся іх і апошніх іхніх пагроз; знайце, што яны ўжо самі дрыжаць ад страху і прадбачаць дрэнны канец свайго панаваньня. **Дык ня пужайцеся гэтых часовых арыштаў і пагроз.**

Калі вы не паддадзіцеся першай навале азвярэўшых насільнікаў і зробіці належны рашучы адпор, спакойна і цьвёрда вядучы сваю працу і далей, дык самі пабачыце як яны крута пераменяцца, памягчэюць і стануць уважаць вас. Бо на пашану заслугоўвае той, хто сам сабе знаець цану. І кожны, хто зразумее сваю высокую і важную роль у час выбараў перастане баяцца пострахаў і арыштаў, бо ён захацеў быць вольным і зразумеў, што павінен быць вольным.

На выгадак жа арыштаў ці іншага насільля неадкладна паведамляйце бліжэйшы Беларускі Выбарны Камітэт, які зробіць перад вышэйшай уладай належныя захады і крыўдзіцелі будуць пакорныя, а пакрыўджаныя звольнены. **Крыўдзіцелі не панясуць кары толькі тады, калі вы будзеце маўчаць аб крыўдзе.** Пры гэтым заўважце, што чым больш будзе арыштаў, тым лепш для нас, бо больш паляпіць нягодных ліхадзеяў з урадовай службы, каб даць месца людзям карысным для народу.

Вышэйшай уладзе Польшчы патрэбна, каб выбары прашлі свабодна і справядліва, бо Польшча дзяржава маладая, шмат зямель, а між імі беларускую зямлю далучыла да сябе сілай аружжа, а Эўропа яшчэ не прызнала гэтага далучэньня. Дзеля таго Польшча хоча, каб усе народы выбіралі ў Сойм ахвотна і свабодна далучыліся да яе.

Памятайце, што няма страшнейшай праступнасьці як насільле ў час выбараў, што гэтае насільле будзе строга карацца, толькі не маўчыце аб ім, а паведамляйце Беларускія Выбарныя Камітэты.

Карыстайцеся выбарным часам, каб заваяваць сабе волю, каб выбраць сваіх людзей, якія замацуюць гэту волю на заўсёгды.

Выбірайце людзей, якія выйшлі з народу, жывуць яго радасьцямі і горам і адважна змагаюцца за лепшую будучыну.

✦✦✦✦

ГРАМАДЗЯНЕ! Аб кожным нарушэньні адміністрацыяй свабоды выбарнае агітацыі, аб кожным арышце за перадвыбарную агітацыю, аб нявыдачы дакумэнтаў і другіх нарушэньнях закону ураз-жа паведамляйце на пісьме Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт у Вільні (Віленская вуліца дом № 12, кв. 6), або свой беларускі павятовы ці акружны камітэт—найлепш не праз пошту, а праз пасланца.

Перад выбарамі.

Праваслаўнае духавенства за Блёк нацыян. меньш.

Гарадзенскі архірэй Уладзімер даручыў духавенству сваей эпархіі, каб яно вяло выбарную агітацыю за Блёк нацыянальных меншасьцяў. („З. С.")

Зьмены ў выбарным законе.

Сябром Абводавых Камісіі і давераных ад грамадзянства („mężowie zaufania") дазволено галасаваць ня толькі ў сваім абводзе, дзе яны ў сьпіскі занесены, але і там дзе яны будуць працаваць у час галасаваньня.

Зьмена гэтая зацьверджана уладай.

Павятовыя зьезды.

1-га кастрычніка адбудуцца павятовыя зьезды Лідзкага акругу. Местам зьезду Валожынскага Ашмянскага і Лідзкага паветаў назначана Ліда, а Вялейскага — м. Маладэчына.

2-га кастрычніка ў Вільні адбудзецца зьезд выбаршчыкаў па Лідзкаму акругу.

Прадвыбарны зьезд у Лідзе.

22 верасьня ў Лідзе адбыўся зьезд прадстаўнікоў ад паветаў Лідзкага акругу, на якім былі прысутнымі: прадстаўнік ад Беларуск. Цэнтр. Выбарнага Камітэту гр. Тарашкевіч і камісар па выбарных справах на Лідзкі акруг гр. Аўсянік.

Учасьнікі зьезду выказалі шчырую прыхільнасьць і даверае да Бел. Цан. Выбарн. К-ту і цалком далучыліся да яго.

Пасьля інфармацый з месц высьнілася, што ўсюды беларускае насяленьне страшна напужана арыштамі і зьдзекамі месцовай адміністрацыі і баіцца адкрыта выступаць у выбарнай працы.

Уплывы партыі «Вызваленьня» падаюць там, дзе пачынае працаваць Цан. Белар. Выбарны К-т.

На зьездзе пастаноўлена адчыніць агітатарскія тыднёвыя курсы. На курсы будуць прыймацца асобы толькі з рэкамандацыямі ад паветовых камітэтаў.

Устаноўлены літэратурные пункты: Ліда на Лідзкі і Валожынскі паветы і Маладэчна на Вялейскі і Ашмянскі пав.

Усімі прадстаўнікамі было адзначана атсутнасьць на месцах выбарных камітэтаў іншых нацыяў, уваходзячых у Блёк. Асабзівая інэртнасьць адчуваецца з боку жыдоўскага грамадзянства.

Мітынг у Гародзьках.

21-га верасьня, у кірмашовы дзень адбыўся мітынг у Гародзьках, Валожынскага павету. На мітынгу выступалі сябры Забрэзенскага камітэту і прадстаўнік ад Цантр. Выбар. Каміт. гр. Туркевіч. Пасьля мітынгу сяляне, сабраўшыся ў большую хату, зрабілі нараду па выбарных справах на якой, паміж іншым, прысягнулі адзін другому галасаваць толькі за беларускі сьпісак. Нарада кончылася дэклямацыяй вершаў родных паэтаў і агульным пяяньнем: „Ад веку мы спалі".

Прадвыбарная „свабода".

— У мяст. Докшыцах, Дунілавіцкага павету паліцыя арыштавала за прадвыбарную агітацыю у карысьць Блёка, студэнта Пяткевіча. Алабралі і ня вярнулі намяры газэты „Кгупісу". Саставілі пратакол. У той жа час на мітынгу быў арыштаваны селянін Сьцяпан Крыкун за тое, што не хацеў аддаць паліцыянтам газэту „Кгупісu".

— У мяст. Хаценчыцы, Вялейскага п. паліцыя арыштавала 19 верасьня трох беларускіх агітатараў Цантр. Выбар. К-ту: Скабея, Сярэбранікова і Нарко. Арыштаваных запужывалі, кажучы, што яны ім адаб'юць ахвоту агітаваць. Дзякуючы захадам Цантр. Белар. Выбар. К-ту арыштованых пасьля пяці дзён выпусьцілі.

— На ст. Маладэчна наш агент хацеў расклеець выбарныя інструкцыі і адозвы, але адміністрацыі станцыі запрэставала проціў беларускіх адозваў і не дазволіла расклеець.

✦✦✦✦

Досьвіткі.

(*Драматычныя сцэны.*)

Глядзі № 21.

Уваходзіць вучыцель і уносіць зьвязаныя кнігі

— ВУЧЫЦЕЛЬ (аціраючы пот) Ух, замарыўся, зьнямогся... Але хоць крыху адратаваў... Як шмат вас тут сабралася...

— ДЗІЦЯ. (аглядаючы кнігі) Аей, як абгарэлі... Во дзе „зорка", а замурзалася як!

З ГРАМАДЫ: — А чаму гэта вучыцель не ўцёк ад ворагаў.

— Нам дык няма куды, але вам з сьветлай галавой дарога адкрыта.

Адна з кабет пяе калысанку.

ВУЧЫЦЕЛЬ. Не магу, бо тут асталося наймілейшае, найдаражэйшае душэ маей.

З ГРАМАДЫ: — Хто гэта?

ВУЧЫЦЕЛЬ (прытуляе дзіця). Во хто—Маладая Беларусь. (да дзіцяці) Скажы мне ўцеха, гордасьць мая ці любіш Беларусь?

ДЗІЦЯ. Як жа мне яе ня любіць, калі яна багаціць і акрыляе душу маю, калі я першы раз згледзіў тут сонейко, неба, пачуў калысанку ў матчынай мове. Люблю за яе хараство, люблю за тое, што нікога Беларусь ня крыўдзіла і не няволіла. Люблю ўсей моцай душы сваей.

ВУЧЫЦЕЛЬ. А ці верыш у Беларусь?

ДЗІЦЯ. Моцна веру, што закрасуе наша сярмяжная Беларуская праўда, што Беларусь будзе жыць на славу і шчасьце людзей. Веру, бо мая вера мае мучанікаў.

ВУЧЫЦЕЛЬ. А ці ратаваць Беларусь будзеш?

ДЗІЦЯ. Усюды і заўсёды, з потам і кроўю, бо люблю і веру ў Беларусь, бо без яе няма мне жыцьця, бо ніхто яе не паратуе, калі ня мы, дзеці яе.

ВУЧЫЦЕЛЬ. Слухайце-ж вы сівыя бароды і знайце, што тыя, якіх яшчэ няма, будуць яшчэ мілейшыя, яшчэ даражэйшыя.

ДЗЕД. Добра вы, пане вучыцель навучаеце нашых дзетак, толькі-ж нас гэтым ня усцешыце. Ня прыждаць ужо нам радасных дзён—дым з пажарышч нашых вёсак выесь вочы, голад паморыць нашых дзетак... Гора нам, гора...

СЕЛЯНІН. З прадвеку мы цярпім крыўду і занепад сваей Бацькаўшчыны, ямо чорны хлеб наймітаў, нявольнікаў—аб гэтым сьведчуць нашыя бледныя твары, пашчапаныя ад працы рукі.

З ГРАМАДЫ: —І раны, калецтвы нашых сыноў.

— І крык звар'яцелых матак.

— Як былі паднявольнымі, так і астанемся стагнаць пад чужацкім ярмом.

ВУЧЫЦЕЛЬ. Ніколі! Годзі трызьніць! Жыва мова—жывець народ. Беларусь ужо ўваскрэсла. Сярод пажарышчаў, над трупамі замучаных, над стаптанымі нівамі ўсходзе сонца лепшай долі, сонца нашага адраджэньня. Бурная радасьць дрыгаціць у нутры. Неўстрымана рвецца крык з грудзей: Жывець Беларусь! І гэтая праўда найчысьцей, найглыбей у нас захавана. Слухайце, як маё сэрца гвалтоўна б'ецца ад каханьня да роднага Краю. Гляньце, як вочы мае зігацяць адвагай, бо я жадаю вялікіх, слаўных спраў, працы без супачынку,—як чало маё гарыць ад вагністых думак. Я аддаў гэтай зямельцы стаптанай, пагнумленай крыўдзіцелямі, прыблудамі, аддаў усё сваё жыцьцё, сваю душу і за гэта яна пагразіла мяне моцай магучай, непакананай. І няма мне перашкод, і няма тых кайданаў, якія змаглі-б скаваць маю волю, акарнаць мае лёгкакрылыя думкі...

МАЛАДЗІЦА. (убегае раненая, збалочаная, абараваная). Ратунку! Збаўленьня! Там... вёску нашу паляць. Там збойствы, зьдзек!.. Трупы, кроў пад нагамі! Дзіцятка маё ў вагонь кінулі. Я ад паняверы чуць выратавалася... паранілі... намучылі... Помсты! Помсты!

З ГРАМАДЫ.—Значыць хутка тут будуць.

— Што рабіць? Куды дзецца?

— Прапалі!

— Ох, ох...

— А мо нас як абмінуць?

Чуваць далекія выстралы. Куля разьбівае абраз на сьцяне, які з брязгам валіцца далоў.

— Кладзіцеся! На падлогу! Кладзіцеся!

— Ох, Бог на нас ужо забыўся!

— Уцекайце, уцекайце!

МАЛАДЗІЦА. (заступае дзьверы). Стойце! Уцекаць... чаго уцекаць? Укралі што? Душагубы вы? І ці уцекаючы абароніце сваю сямью, дамову, дабро. Куды уцекаць у лясы, балоты? Да звяроў, гадоў? Ды вы самі горш звяроў. А загінеце не вялікая страта.

З ГРАМАДЫ.— Пагібель тут нам!

— Уцекаць, уцекаць...

— На бок яе! Бі яе!

МАЛАДЗІЦА. Не пушчу недалюдкі. Праз труп мой пройдзіця! Хай кроў мая спляміць павек вашую гідкую душу, а здань замучанай маці заслоніць вам сьвет. Праклянцьце на вас, душагубы. Хай страшная помста падзе з неба на вас і вашых дзяцей...

ДЗЕД. Стой баба не праклінай! Мы ужо і так пракляты...

З ГРАМАДЫ:—Яна праўду кажа. Няма чаго і няма куды нам уцякаць.

— А вышчарылася, дык як зьмяя.

— Ат! Ды мне усё роўна: як усе.

— Усёткі сьмерці ў зубы лезьці не ахвота.

ВУЧЫЦЕЛЬ (да Маладзіцы). Вы супакойцеся. Трэба усё цярпліва пераносіць. Дайце я вам рану завяжу. У вас рана крывавіцца (рвець хустачку і хоча завязаць рану).

МАЛАДЗІЦА. Боль душы заглушае бол[illegible] маіх ран. Ня гэтым рызманом трэба лячыць ра[illegible]ны і не па гэтыя лекі я да вас прышла.

ВУЧЫЦЕЛЬ. Дык што ж нам рабіць — [illegible] бяссільны.

З ГРАМАДЫ:—Але, што рабіць.

— Кажы, калі такая разумная.

МАЛАДЗІЦА. Хіба-ж вам мала кажаць [illegible] жарышчы, парытыя, здратаваныя нівы, трупы [illegible]шых дзяцей і жонак і гэтая кроў, што цячэ [illegible] мне. Вы глухія на крык болі, на крык а пом[illegible] Вы толькі послух маеце там, дзе посьвіст на[illegible]кі і тады, калі споласуюць вашу скуры ў кры[illegible]выя градкі. Вы больш не бацькі, не браты і [illegible] грамадзяне, а шкурнікі, здраднікі, бабскія аб'е[illegible]

З ГРАМАДЫ.—Во разанула!

— Праўду баба кажа.

— Ды ўжо-ж—гніллякі...

— Хлопцы! Пачнем з малога: сабяром [illegible] якое аружжа, а там розум нам падскажа.

— Ды ужо-ж, раз паміраць!

— Надта ўжо надакучыла гэтае безгалоў[illegible]

— Гэй, там! Часу не марнуйце, каб па[illegible] позна ня было.

Беларусы, закладайце Выбарныя Камітэты, станьце у абароне сваіх правоу!

Як утварыўся Блёк Нацыянальных Меншасьцяў.

У адказ усім тым нягоднікам, што выдумляюць рознаю брахню на Блёк Нацыянальных Меншасьцяў, утвораны дзеля правядзеньня выбароў у Сойм і Сэнат, — даем тут жменю фактаў, якія паказваюць, якой дарогай беларусы дайшлі да Блёку.

1 ліпеня Беларускі Нацыянальны Камітет пастанавіў: дзеля абароны правоў беларускага насяленьня пад уладаю Польшчы прыняць чыннае ўчасьце ў выбарах у Сойм і Сэнат.

25 ліпеня утварыўся Беларуска-Украінскі Блёк.

7 жніўня да Беларуска-Украінскага Блёку далучыліся Расейцы ўсяе Польшчы.

17 жніўня на канфэрэнцыі нацыянальных меншасьцей да Беларуска-Украінска- Расейскага (або Славянскага) Блёку далучыліся Немцы і Жыды ўсяе Польшчы.

16 верасьня да Беларускага Цэнтральнага Выбарнага Камітэту, які ўваходзіць у склад Блёку, далучыліся Староверы.

✦✦✦✦

З газэт.

Газ. „Сов. Беларусь“ піша:

У Горадзеншчыне, у Віленшчыне, у занятой палякамі часьці Меншчыны душыцца ўсё беларускае толькі за тое, што яно беларускае. Самым звычайным мэтадам барацьбы з беларускай нацыянальна-культурнаю працаю на абшарах Заходняе Беларусі зьяўляецца абвінавачваньне беларускіх дзеячоў у бальшавізьме і ў дзяржаўнай здрадзе.

Беларусы нават ня могуць чытаць газэты на сваей мове, газэты афіцыяльна дазволенай польскай уладай, беларусы ня могуць нават называць сябе беларусамі, бо за кажды м нацыянальна сьвядомым беларусам устанаўліваюць паліцэйскі нагляд. Беларускія школы, беларускія каапэратывы, беларускія культурна-асьветныя гурткі, — усё гэта зачыняецца.

Але усё-ж такі беларусы жывуць і будуць жыць! Прыбліжэньне выбараў трохі ажывіла надзеі беларускіх нацыянальна - культурных працаўнікоў і заставіла іх прыняць удзел у перадвыбарнай барацьбе. Яны думаюць, што, аб'яднаўшыся з прадстаўнікамі другіх уціснутых у Польшчы нацыянальных меншасьцяў, яны змогуць мець аднаго абаронца сваіх інтарэсаў у будучым Сойме, мець трыбуну, з якой будуць апавядаць усяму сьвету аб сваіх крыўдах.

✦✦✦✦

З Савецкай Беларусі.

Хаты—чытальні.

Цэнтрам адпушчаны на утрыманьне хат-чытальняў на Беларусі значны лік грошай. Грошы перададзены Павятовым Палітасьветам.

Пьесы Галубка.

Новыя пьесы Галубка „Акрываўлены падатак“ драма і „Культурная цешча“ камэдыя, якія ставяцца у залі „Хата Селяніна“ у Менску, карыстаюцца вялікай папулярнасьцяй.

Вёска Падлінцы на Случчыне.

Вось як ідзе жыцьцё ў нашай вёсцы. Сенакосы ўжо скончаны. Трава ўрадзіла ня кепска. Асабліва добры ўраджай быў на канюшыну Шкада, што яе было мала пасеена — зьявілася за апошнія часы. Вельмі леташняя сухая вясна і лета і бесьсьнягавыя зімы ёй пашкодзілі. А надта добра родзіць тутэйшая мясцовая канюшына, якая звыклася з нашым кліматам, глебаю краем.

Жыта тактама добрае парасло. Ужо пажалі. Пагода стаіць ня зусім прыемна для сельска-гаспадарчай працы. Дажджы праходзяць часта. Надта добра расьце трава для скаціны.

На лён і порах напала шкодная вусень—соўка гама. Некаторыя пасевы зьедзены у шпыл, не застанецца навет і насеньня. З лёну і гораху гэты шкоднік перакінуўся на бульбу і канюшыну, якую таксама шмат папсаваў. Сялянства глядзіць на гэта, як на кару боскую; барацьба ніякая не вядзецца. Ды яна цяпер і немагчыма, калі шкоднік зьявіўся ў такой буйнай колькасьці. Сама прырода пашла насустрэч гэтай вялікай пагрозе нашаму дабрабыту.

Культурнае жыцьцё вёскі прыпынялося. Культурна-асьветны гурток вёскі, здаецца памёр на самай вясьне свайго жыцьця. Калі адродзіцца ці ўвасьрэсьне, будзе вялікае дзіва. Старыя сябры гуртка вучні сярэдніх школ, разьехаліся за асьветаю. Малодшыя кінуліся на шляхі гульняў-скокаў. Наогул, няма каму працаваць, няма штырхача-кіраўніка, людзі ёсьць, а чалавека няма. Немагчыма вясьці і маленькае культуральнае працы, калі ня створана матар'яльная база. Пры ўсім сваім жаданьні нельга стварыць бібліятэкі, чытальні — ўсюды ганяюць, усюды сьмяюцца. Газэты на вёсцы не атрымліваюцца. Бывала, калі прысылалі дарма, то хоць курцы іх пільнаваліся, ды чыталі. Затое і жывуць нічога ня ведаючы, што робіцца на сьвецьце. Пра хлебны заём ня чулі. Толькі ходзяць розныя чуткі.

Паўлюк.

(„С. Б.“)

✦✦✦✦

Песьняру Зямлі Нашай.

19 верасьня места Вільня памянула вялікага песьняра нашае Зямлі, кампазытара Станіслава Манюшкі: яму паставілі памятнік — на скверы каля касьцёлу св. Катарыны.

Справай пабудаваньня памятніка занялася рада места Вільні. А як у гэтай радзе пераважаюць палякі — і то палякі-нацыяналісты, дык і памінаньню Манюшкі быў дадзены від польскага нацыянальнага дзела.

Вялікія душы вялікія таленты заўседы бываюць далёкія ад нацыянальнае выключнасьці, іх сьветагляд сягае шмат далей, чым на тое пазваляюць вузкія рамкі мяшчанскага нацыяналізму. Такім быў і Станіслаў Манюшка: верны сын нашага краю, ён рос пад гукі роднай беларускай песьні, чарпаў поўнай жменяй з скарбніцы беларускага народнага творства матарыялы і настроі дзеля свайго ўласнага творства і, творучы новыя музыкальныя цэннасьці, ніколі не забываўся аб народзе, які яго ўзгадаваў. І Манюшка працай сваей аддзякаваў беларусам: гэты песьняр, абвешчаны цяпер польскім нацыянальным кампазытарам, быў т в а р ц о м п е р ш а е „б е л а р у с к а е о п э р ы.

Манюшка, родам з Меншчыны, быў у блізкіх адносінах з першымі беларускімі адраджэнцамі сярэдзіны мінулага веку. Асаблівая дружба злучала яго з нашым выдатным паэтам, Вінцуком Дунін-Марцінкевічам, да творчае працы якога Манюшка адносіўся з шчырым спогадам. І вось два прыяцелі супольнымі сіламі робяць вялікае дзела: Манюшка піша музыку, а Марцінкевіч дае лібрэтто (словы) опэры „Сялянка“. У пяцьдесятых гадох мінулага сталецьця гэту опэру некалькі разоў ігралі на сцэне менскага тэатру.

На вялікі жаль да нас дайшлі, толькі словы „Сялянкі“ толькі афішы аб спэктаклях: ноты манюшкаўскага твору недзе запрапалі. Але ўдзячная памяць аб Манюшцы ў беларускім грамадзянстве не запрапала: беларусы места Вільні горача прынялі да сэрца справу ўшанаваньня Манюшкі 19 верасьня і грамадой зьявіліся на адкрыцьце памятніка. Былі тут прадстаўнікі беларускага тэатру, культурных установ, беларускае гімназіі. Найстарэйшаму працаўніку беларускае сцэны, грам. Аляхновічу, было даручана ў прамове выразіць глыбокую пашану беларусаў для творца першае беларускае опэры.

Аднак, апошняга зрабіць не ўдалося: прэзыдэнт места Вільні, пан Банькоўскі, ня даў беларусам голасу...

Зьмяніліся часы, зьмяніліся людзі. Але нашы адносіны да вялікага песьняра нашае Зямлі не зьмяніліся і ня зьменяцца, — і мы хоць на гэтым месцы памінаем яго.

Ант. Навіна.

— Хадзем! Хадзем!

ВУЧЫЦЕЛЬ. Грамадзяне! Спыніцеся! Перасьцерагаю вас — ня будуйце на крыві свае шчасьце. Сіла не ў штыку і ня там, дзе пануе дужэйшы, а там дзе ўсе роўныя, дзе гарт душы і еднасьць думак.

Чуваць выстрал. Вучыцель ускрыквае і валіцца нежывы на зямлю. Усе з жахам расступаюцца.

МАЛАДЗІЦА. Вось вам што рабіць: гінуць пакорна ад варожай кулі і пакінуць дзяцей у той няволі, у якой і самі гібееце. Альбо ісьці за мной, а кроў маіх ран вызначыць вам дарогу...

З ГРАМАДЫ: — Не абмінуць ужо нам сьмерці...

— Ах, Божа моцны, згінуў за нішто.

— Такі чалавек!

— А ды годзі ўжо вам лапатаць языком, бачыце, бягуць сюды.

— Бабы і дзеці хавайцеся ў склеп!

— Сьмерць за сьмерць!

— За праўду Бацькаўшчыну і волю!

Кабеты і дзеці рупна выходзяць. Кожны шукае чым бы бараніцца. Усе валтузяцца, крычаць; сярод моладзі жартуюць, сьмяюцца.

— Агата! А ты чаму ня узброешся?

— А яна языком больш наробіць, як ты тапаром.

— Бабы бяруць з сабой маладзіцу—аслабела яна, пабялела, як палатно.

— Стой! Не чапай—гэта таўкач мой, я сабе...

— А я з чым буду?

— Аддай!..

— Ціхаце! Дайце слова сказаць,—тут не да жартаў. Вы, старэйшыя, ідзіце ў Міхасёвыя каноплі, а мы тут іх каля хаты прывітаем ды тады з запал і сашчэпім. Толькі завіхайцеся, бо справа крутая.

— Добра! Добра!

— Хадзем! Хутчэй!

— Гура!

— Складна прыдумаў.

— Павадыром яго, камандзерам зрабіць!..

— Жывей там чалдыхайцеся — ідуць, як на выгон.

Усе выходзяць. Астаецца на ложку хворы. З пад печы вылазіць селянін — баязень.

БАЯЗЕНЬ. Пфу! Нанюхаўся курынай пармы.

ХВОРЫ. А ты чаго пад печ залез?

БАЯЗЕНЬ. Я так сабе. Ня думай, што я баюся — гэта нашы. А прылёг я — ведама кулі дурныя.

ХВОРЫ. Ах, ты брыда! Дык гэта твае, што глумяць нашае дабро, гвалцяць нашых дзяцей, топчуць нівы, дык гэта твае? Дык ідзі адгэтуль, да сваіх ідзі... Вон кажу..

БАЯЗЕНЬ. Ой, братка, баюся!.. Хоць бы яшчэ дзянёк пажыць... Чуеш?

На двары чуваць выстралы і крыкі: „Гура! Бійце іх душагубаў, зладзееў! Даганяй гэнага куцага! Стой гіцаль, не уцячэш! Ай, ратуйце!“ Хворы з натугай сьлядзіць праз вакно.

БАЯЗЕНЬ. (лежучы на падлозе) Куды ты вытыркаешся — кладзіся на зямлю... там кулі...

ХВОРЫ. Вон! Не пагань хаты. Каб у міг...

Баязень ойкаючы пераступае парог.

ХВОРЫ. (сьлядзіць праз вакно, цяжка дыша, мучыцца за сваіх; гавора хрыпла) Ага, пагналі нікчэмнікаў! Нашыя ужо і аружжа маюць! Здаліся... вун толькі.., Ах цэліцца!.., Божа.., (крычыць) Беражыся! Толар схіліся!... (выстрал) Ха ха ха... Хібіў... Кінуў рушніцу, уцекае... А там з пад рэчкі выходзяць другія... ворагі... А шмат іх, як гразь цячэ.. (рупна устае, хістаецца) Памагаць... разам... не паддацца... як цёмна... дзе дзьверы... разам... не паддацца.. (валіцца не жывы; узышоўшае сонца асьвечае яго. Чуваць водгульле барацьбы.)

К а н е ц.

Лявон Жыцень.

✦✦✦✦✦✦

З а к л і к.

Брат мой мілы! Ты хмарней хмары, чарней зямлі. Вочы поўныя сьлёз няпэўна, трывожна перабегаюць даль. Ты блудзіш!

Брат мой мілы! Падарожны нашых непраходных пушч. Грозныя буры цябе аглушылі. Халодная цемра асьляпіла. Зьнемагла цябе галодная бяда.

Які ліхадзей адважыўся кідаць каменьнямі і так параніў тваё цела.

Якое-ж гэта ліхалецьце загнала цябе ў гушчар нетры, на бездарожжа.

Спыніся брат мой, прысядзь на прызбе маей хаты вясковай, пахілай і дай пачуць свае новае слова—аб мудрай задуме засеянага поля, аб прарочым гомане векавечнага бору, аб нашым, блізкім, родным... Распелянай душу сваю ад залатых кос сонейка і сінявы нябеснай. Хай здаровая нагата яе будзе уміленьнем у сумную часіну.

Калі-ж ты шукаеш Бога, каб напоўніць сэрца і асьвяціць душу сваю, што як бажніца без Бога, пустуе ў забыцьці, дык увайдзі брат мой у маю хату вясковую, пахілую. Там ты, без малітвы і слоў, усей істотай сваей, пачуеш, уразумееш Бога і будзеш радасны.

Калі-ж ты ачмучаны крыклівай праўдай, якой чураўся, ашуканы багатымі абяцанкамі, якія шкодны табе; калі ты сярод хвальшывага бляску не пазнаеш сябе, сярод чужога горада згубіў сябе, дык увайдзі брат мой мілы ў маю хату вясковую, пахілую. Там пазнаеш глыб і чыстату душы сваей і будзеш радасны.

Калі ж ты безнадзейны, няўсьцешны нічога ня шукаеш бо дагэтуль знаходзіў толькі церні і роспач; калі цень сьмерці заступіла красу і уцеху жыцьця, а небыцьцё вабіць у бяздонную цемру, дык схамяніся брат мой і увайдзі ў маю хату вясковую, пахілую, дзе багуе каханьне і гаспадарыць праца-весялуха. Там на стале, адліваючы срыбрам, красуе даматкаеы абрус, на ім ляжыць пушаны, пахучы хлеб, соль у бяроставай ступачцы, а ў паліваным жбанку сыта сытная. Адтуль відаць як рожавеець белаліловы золак. Там на Вялікдзень абразы на покуце ахарашываюцца дзеразой, а на Сёмуху пахніць ярам пасыпаным. Там, скаголеньне злой сьнежнай мяцеліцы, разьбіваецца аб паважны спакой дабрадзейкі печы, якая зьмярканьнем затуляе ў цеплую драмату. Там, брат мой мілы, аддыхнеш душой, падужэеш целам і праславіш музыку жыцьця.

Дык увайдзі, брат мой мілы, ў маю хату вясковую, пахілую, а будзеш дарагім гасьцём і зрадуеш мяне засмучонага ад жудаснай сучаснасьці.

Увайдзі — —

Л. Р.

✦✦✦✦

Верш Наума Прыгаворкі.

На прыезд да Менска Апалінарага Контскага Уладыслава Сыракомлі і Станіслава Манюшкі. 25 кастрычніка 1856 году.

Засьвяцілі тры гвездачкі ў пару нам шчасьліву!
Заляцелі тры сакалы дый на нашу ніву!
Ня гвездачкі ж то нябесны, што ярка мігаюць,
Ня сакалы, што шырока бушуюць у полі;
А прыбылі тры дудары, — так пяюць, іграюць,
Што ангелы надзівіцца ня ў сіле здаволі!
Адзін дудар з ляцкай нівы, тож братняя ніва!
Другі з Вітавай асадзьбы, быццам адной маці!
Госьцікі ж то дарагенькі нечага казаці,
Серцэм, душой іх прымайце! то ж мілянькі дзіва!!
А трэці дудар між намі узрос ён братка.
Яму Мінская зямелька родненькая матка.
Адзін смыкам як пацягне па сваёй скрыпіцы,
То салодкі брызнуць сьлёзы, маўляў із крыніцы;
Душа жарам абальецца, ад роскашы млее!
Бы па працы чарка водкі жывот абагрэе.
Другі дудар як запяе пад дудку сваячу,
Вось і добры пан заплачэ — і я з ім заплачу:
Із губ сыпець ён славечка, як краскі прыгожы,
Рубіць пярцом, як тапарцом, праўдай на сьвет Божы.
Чамуж гудуць яго песьні быццам салавейкі?
Бо ўсе пад свойску дудку, ўсе з роднай зямейкі!
Трэці дудар як загудзе песянькі радненькі,
Бяду, дый гора забудзеш, станеш весялечькі!
А так думкі прыуныўны соладка сьпевае,
Што за серца, бы клешчамі, дзетачкі хапае!
Злосна вам сыны заморскі, завідна панята,
Што славянская зямелька у розум богата
Вы-б хацелі ўсе розумы і сваі і нашы,
Маўляў саранча на ніве, паесьці у кашы,
Ня дажданьня ж мудрагелі! - і нашая ніва,
Вялікімі дударамі уздаваль шчасьліва!
Бійця ж чалом тром сакалом хлапцы, маладзіцы!
Гэта ж кветкі с свойскай веткі, славянскай зяміцы!!

Вінцук Дунін-Марцінкевіч.

Падаткі.

Якія толькі падаткі цяпер ня прыходзіцца ў нас плаціць! Тутака і простыя—абложэньняў ад паходаў і скрытыя, якія плацілі і не адчуваючы гэтага. Заяву падаць у ўрадовую ўстанову—плаці, пасьведчаньне атрымаць—плаці, на рынак селянін прыехаў тавар прадаваць—плаці, каб прадукты на вёсцы купіць і прынясьці на плячох ці прывясьці машынай—бяры патэнт і за яго таксама плаці, за сваю зямельку—плаці. Куды ня пхніся ўсюды плаці і плаці падаткі ў скарб. А вось вам і скрытыя падаткі: акцыз на гарэлку, акцыз на табаку, на папяросы, на гарбату, сахарыну, сярнічкі і г. д. Купляеш патрэбныя табе рэчы і ўзноў плаці падаткі і так бяз канца. І ўсе гэтыя падаткі наложаны не на такія рэчы без якіх можна было б абайсьціся, як напрыклад гарэлка і не на рэчы багацьця, купляючы якія аблагаліся б тыя людзі, якія багацейшыя, але ўсе налогі наложаны на рэчы першай патрэбы. Возьмем сахарына. Вёска цяпер цукар бадай зусім і ня купляе, а ўжывае ў значным ліку сахарыну таксама як пера-гажна яго ж ужывае і гарадзкая беднага. Дык вось жа гэты найпатрабнейшы прадукт як раз і абложаны акцызам. Таксама з сярнічкамі, гарбатай і г. д. Багацеі такімі акцызамі мала пакрыўджаны, бо яны даходы маюць больш беднага, а купляюць прадуктаў першай патрэбы бадай столькі, колькі і бедны; значыцца плоцяць падаткі нараўне з беднымі. Дагэтулішні ўрад Польшчы ўсе падаткі ўзваліваў на плечы бяднейшага клясу, што зусім зразумела, бо дагэтуль у Польскім Урадзе верхаводзіла панская партыя багацеяў так званая эндэцыя. Прадстаўнікоў простага беларускага народу ў Варшаўскім Сойме, дзе абгаварываюцца падаткі няма, і вось, як ведама, вынік гэтага той, што наша вёска ажно стогне ад цяжару падаткаў у скарб.

Але ня меней стогне прамысловасьць і гандаль, які аблагаецца падаткамі ад даходаў у страшэнна вялікім разьмеры. Зразумела, што гандляр і прамысловец, маючы на ўвазе, што прыдзецца плаціць падаткі накладае на тавары большыя цэны і ўзноў-жа бедны жыхар вёскі і горада больш расплачываецца сваей кішанёй, купляючы ў гандляра патрэбныя сабе рэчы.

Да гэтага трэба дадаць, што падатковыя чыноўнікі ў нас адны палякі—быўшыя паны маёнткаў ці іх сыны, якія і робяць так, каб толькі ім добра было.

Дык вось-жа мы бачым, як важна, каб у Сойме былі прадстаўнікі ад нас працоўных беларусаў, якія б стаялі ў абароне беларускіх інтарэсаў. Нашыя прадстаўнікі не пацярпелі-б гэткага разлажэньня падаткаў, яны зрабілі-б так, каб на таго, хто мае большы даход, хто багацейшы, той і павінен плаціць большы падатак.

Пу—га.

Што чуваць у сьвеці.

Выбары ў Латвійскі Сойм.

7 і 8 кастрычніка адбудуцца выбары ў Латвійскі Сойм. Уся Латвія падзелена на 5 выбарных акругоў: 1) Лібаўскі (Курляндыя), 2) Мітаўскі (Земгалія), 3) Ліфляндзкі (Ліфляндзія), Рыжскі (горад Рыга), 5) Латгальскі (Латгалія).

Беларусы ідуць на выбары сваім асобным сьпіскам, № 21, на чале якога стаяць: гр. гр. Кастусь Езавітаў, Сяргей Сахараў і Астап Хруцкі.

Забойства Дзяржынскага.

У Маскве няведамымі людзьмі забіты прадседацель чэка Дзяржынскі. Месца яго заняў Пэтэрс.

На Балканах не ўціхае.

Туркі заявілі, што займуць Канстантынопаль не зважаючы на ніякія перашкоды. У Фракіі ідзе падгатоўка да турэцкага паўстаньня.

Англія згодзілася аддаць Турцыі Фракію і Адрыянопаль, каб толькі захаваць нейтральнасьць праліваў.

Сэрбы пасылаюць свае войскі для абароны Канстантынопаля і Фракіі.

Туркі групіруюць войска каля Ісміду, каб ударыць на Канстантынопаль.

Савецкая Расея пратэстуе проціў усіх умоў і пастаноў, адносна да праліваў зробленых без яе.

У Афінах раскрыты вялікі загавар проціў існуючай улады.

Аб'еднаньне нямецкіх соцыялістаў

У Аўгсбургу адбылося аб'еднаньне нямецкіх соцыял-дэмакратаў і незалежных соцыялістаў. Абедзьве партыі выпрацавалі супольную праграму.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Беніца, Ашмянскага пав.

Я ўжо пісаў аб тым, што ў нашай гміне зачынілі ўсе беларускія школы. Такой несправядлівасьці нашыя жыхары ня чакалі. Думалі, што гэта абмылка. Пачалі спраўляцца. Хадзілі, езьдзілі, дабіваліся. І чаго-ж дабіліся? Нічога! Нам тубыльцам гэтага краю, рэвіровы пан Савіцкі не дазволіў нават склікаць сход, на якім мы маніліся прасіць гмінную раду перагледзець сваю пастанову і дазволіць існаваць беларускім школам. Нас здзівіла тое, што гэты панок дазваляе сход толькі тады, калі будзем гаварыць аб польскай школе. Вот табе і «роўны з роўным». Тады мы напісалі заяву ў гмінную раду, але і тут закавыка. Відаць праўду гавора наша пагаворка, што: „Дудар дудару дарэмна іграе“. Пан Дэмбскі—старшыня Рады, ён жа і войт, адмовіўся даць паквітаваньне ў тым, што ён атрымаў нашую заяву. Гэта лішні раз толькі паказвае, што на ўсялякія пасады мы павінны выбіраць толькі сваіх сьвядомых беларусаў, якія нас не падвядуць, а будуць рабіць усё згодна закону і справядлівасьці. Копію заявы паслалі ў Вільню ў Беларускую Цэнтральную Школьную Раду, можа яна паможа нашай бядзе, можа яна нойдзе ўправу на сваволльле зазнаўшайся адміністрацыі. Мы яшчэ хочам верыць, што за гэта іх па галоўцы не пагладзяць.

Ш.

Грамадзяне!

2-га кастрычніка (акцябра) г. г. у Вільні (Віленская 12) адбудзецца беларускі прадвыбарны з'езд з усяго Сьвянцянскага вокругу (ад паветаў: Сьвянцянскага, Браслаўскага, Дзісенскага і Дунілавецкага.)

Пажадана, каб ад кожнай гміны былі беларускія прадстаўнікі.

Усе беларусы з гэтага вокругу на з'езд!...

Справы важныя, неадкладныя.

„Зьезд“ беларускіх актывістаў.

18 верасьня адбыўся ў Вільні зьезд „баларускіх актывістаў“, пад кіраўніцтвам нейкага пана Міткевіча. На гэтым зьезьдзе было не шмат людзей, дый то прыехаўшых па асабістаму закліканьню п. Міткевіча. Каго яны прадстаўлялі—ня ведама, ад ім'я каго гаварылі — так сама ня ведама. Ня відаць было сярод зьехаўшыхся прадстаўнікоў нашага сялянства. Сабралася, відаць, свая цёплая кампанія мала каму ведамых „актывістаў“.

Яны сабраліся, каб абгаварыць пытаньне аб выбарах у Варшаўскі Сойм і Сэнат. Яны хочуць ісьці на выбары аддзельна ад сарганізаванага каля Беларускага Цэнтральнага Выбарнага Камітэту беларускага грамадзянства. Яны хочуць раз'біць адналіты беларускі фронт.

Вось якія мэты меў гэты зьезд актывістаў. Але ўжо ў пачатку зьезду стала відна, што п. Міткевічу і яго хаўрусьнікам гэта не ўдаецца. Многа удзельнікаў зьезду, прыходзячы у Бел. Цэнтр. Выб. Кам., або сустракаючыся з Віленскімі беларускімі дзеячамі, з агідаю гаварылі аб п. Міткевічу і яго замерах. З гэтага ясна выявілася, што сярод актывістаў няма ўнутранай спайкі, што паміж імі пануе разлад прынцыповага характэру, да чаго, як мы потым даведаліся, далучаецца яшчэ і разлад з прычыны грошаў, якія верхаводы актывістаў ня так падзялілі. Зьезд закончыўся разнабоем і лаянкамі, як гэтага і трэба было чакаць!

Як бачым, гэта новая спроба разьбіць беларускую еднасьць і аслабіць на выбарах сілу беларусаў—зусім не ўдалася. Дый не магла ўдасца: народ наш ужо збудзіўся, пачуў сваю моц і дружным фронтам пойдзе дабываць сабе правы і волю, дабываць зямлю, дабываць лепшую долю будучым пакаленьням.

Адзінага беларускага фронту ніхто разьбіць ня здолее.

ХРОНІКА.

— З прычыны вызду рэдактара нашае часопісі на правінцыю абавязкі яго часова спаўняе гр. Леапольд Родзевіч.

— **Памёр Казімір Фалькевіч,** вядомы барацьбісты за адраджэньне Бацькаўшчыны, селянін вёскі Шастакі Тургельскай гміны, Віленскага павету.

— **Беларускі тэатр на правінцыі.** 24 вересьня ў Ашмяне быў пастаўлены беларускі спэктакль, беларускай групай пад дырэкцыяй Фр. Аляхновіча. Гралі „Няскончаную драму“ Аляхновіча. Публіка горача вітала артыстаў.

— **Беларуская гімназія у Гарадку** Вялейскага павету існуе ўжо два гады. Сёлета, дзякуючы дырэктару гімназіі гр. Тышкевічу і гміннай радзе, атрымана ад Школьнага куратара канцэсія на 1922-23 год. У гэтым годзе гімназія мае шэсьць асноўных клясаў, забеспечана нагляднымі падручнікамі. Выкладаць навукі будуць салідныя пэдагогічныя сілы. Плата за навуку насколькі было магчыма зніжана. Уступ у гімназію яшчэ адчынены.

— **Масавыя арышты.** У вёсках Вялейскага павету: Путнікі, Алёхнавічы, Вайтэлі, Вайгэлі і іншых адбыліся масавыя арышты беларусаў. Прычына арыштаў ня высьнена.

Мэтады сучаснае пэдагогікі.

Кажуц, што кожная навука ідзе наперад і з кожным крокам робіцца лепей і паважней.

Аднак, гэтага ня можна заўважыць у нашай Віленскай Духоўнай Сэмінарыі. Яшчэ ў леку ў часе Эпархіальнага Зьезду, калі прадстаўніком Эпархіальнае ўлады ніяк нэ ўдавалась правесьці пажаданае для іх рэзалюцыі аб сэмінарыі (як і заўсёды — перашкаджалі „бѣлоруссы“, якія ўнесьлі праэкт рэзалюцыі аб выкладаньні ў Сэмінарыі, па меры магчымасьці, па беларускіх падручніках і на белерускай мове,) зусім не чакана, ў апошні момант спаўняўшы абавязкі Старшыні сэкцыі. (Сам старшыня п. Нядзельскі, хоць і быў прысутным але адмовіўся кіраваць у той момант сэкцыяй з прычыны дрэннага сама цачуцьця) выцягнуў з кішані „заяву вучняў Літоўскае Духоўнае Сэмінарыі“ і голасна прачытаў яе зьмест. Там гаварылась аб тым, што сэмінарысты, дачуўшыся аб нейкай „реарганізацыі“ Сэмінарыі (разумей „у беларускім напрамку) малі-лі сваіх бацькоў-сяброў Эпархіальнага Зьезду, каб яны абаранілі іх ад гэтага, бо яны, сэмінарысты, маюць падцвердзіць, што сэмінарыя з усіх бакоў стаіць добра і ніякіх реарганізацыяў не вымагаець. Усе яшчэ, мусіць, не забыліся, якое ўражэньне мела гэтая заява: сьпярша быццам хапіла обухом па галаве (надта ўжо голасна стараўся яе чытаць спаўн. абавязкі старшыні), а потым астаўся сьлед чагось страшэнна не прыемнага: Кожнаму было зразумела, што дарослыя людзі, як гэта кажуць „зарапартаваліся“ і пачалі шукаць „аўторытэтнага“ падтрыманьня ў дзяцей. Чуткі аб тым, якім чынам зьбіраліся подпісы пад гэтай знамянітай заявай, крышку да нас даходзілі; калі б гэта рабілі дзе небудзь ў глухай правінцыі не даволі сьвядомые людзі, — было-бы толькі сорамна, але, калі такія штукі робяцца тут у Вільні, то мімаволі становіцца боязна за тых дзяцей, якія вучацца ў сэмінарыі. Няўжож не сорамна сэмінарскім пэдагогам і кіраўнікам уцягіваць моладзь у неадпаведныя спрэчкі, якія вядуцца дзеля змаганьня з „бѣлоруссамі“? А тут ізноў пачалі ходзіць нейкія чуткі, што ізноў збіраюцца подпісы сярод сэмінарыстаў — на гэты раз, як кажуць, — з прычыны назначэньня новага Рэктара сэмінарыі. Паважаныя паночкі, супакойцеся! Ніякія вашыя мэтоды не дадуць рады. Моладзь, ня гледзячы на тое, што вы стараецеся ўлажыць ёй у галаву свае думкі, ня пойдзець за вамі; яна пойдзець за тымі, хто павядзець яе па шляху адраджэньня сваей роднай культуры, каб потым стаці не палітыкуючымі манэкенамі, а шчырымі працоўнікамі на карысьць свайго гаротнага народу.

Настулія.

Чытайце, распаўсюжывай і шануйце сваю газэту.

Рэдактар-Выдавец Ф. АЛЯХНОВІЧ.

Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.